*Юлія Акуліч*

# ПРЫНЦЫПЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ Ў ФАЛЬКЛОРНЫХ ЗБОРНІКАХ І НАВУКОВЫХ ВЫДАННЯХ

Вясельныя традыцыі беларускага народа існуюць з пачатку яго этнагенезу і вызначаюцца яскравымі лакальна-рэгіянальнымі асаблівасцямі,

пачынаючы з абрадавай тэрміналогіі, у якой зліваюцца разам міфалагічнае, этнаграфічнае і паэтычнае. Кожны вясельны этап надзвычай семіятычны і таму патрабуе паглыбленнага вывучэння. Гэта асабліва актуальна ў наш час, калі значнасць набывае не проста праблема даследавання, але і захавання культурнай самабытнасці рэгіёнаў. Вясельны фальклор з'уляецца крыніцай каштоўнай інфармацыі аб гістарычнай эвалюцыі і трансфармацыі культурных традыцый, зафіксаваных фалькларыстамі ў розных рэгіёнах Беларусі. Багаты фактычны матэрыял, сабраны даследчыкамі на працягу XIX ст., у асноўным насіў апісальны характар. Унікальны матэрыял, які ахоплівае практычна ўсе этапы беларускага вяселля, зафіксаваны ва ўсіх фальклорна-этнаграфічных рэгіёнах рэспублікі ў XX – XXI стст. Збіральніцкая праца была працягам той, што распачалася ў мінулым стагоддзі. Пашырылася таксама кола з'яў, якія трапілі ў поле зроку фалькларыстаў-філолагаў і этнамузыказнаўцаў. Да фальклорнага матэрыялу ўжываліся разнастайныя метады даследавання, на парадак дня вылучаліся новыя праблемы і задачы. Важнейшым адкрыццём мінулага стагоддзя стала канцэпцыя фальклору як адметнай мовы культуры. Гэта дало магчымасць пашырыць паняцце тэксту, падыйсці да яго з боку камунікатыўнай стратэгіі. Адсюль вынікае, што навуковыя адкрыцці магчымыя і сёння, паколькі многія камунікатыўныя аспекты вясельнай абраднасці ў друкаваных крыніцах не ставіліся, не закраналіся, а калі закраналіся, то мімаходзь.

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляецца вясельная абраднасць Гомельшчыны. У гісторыі яе збірання і вывучэння можна вылучыць два асноўныя этапы:

– канец XIX – пачатак XX стст.: першыя спробы вывучэння, з'яўленне першых уласна навуковых публікацый, прысвечаных вясельнай абраднасці Гомельскага Палесся;

– сярэдзіна XX – пачатак XXI стст.: аналіз назапашаных матэрыялаў, уключэнне вясельных песень Гомельшчыны ў акадэмічнае выданне фальклору (БНТ), пошукі новых падыходаў да асэнсавання вядомых з'яў, матываў, вобразаў, увага да іх міфасемантыкі. Па-ранейшаму актуальнай з'яўлялася праблема сістэматызацыі матэрыялаў, найбольш адэкватнай мясцовай вясельна-абрадавай культуры.

Збіральнікі XIX – пач. XX ст. не толькі імкнуліся з той ці іншай ступенню дакладнасці зафіксаваць вясельны абрад, але і адзначыць лакальныя асаблівасці форм яго бытавання. Эмпірычным шляхам былі вынайдзены два галоўныя прынцыпы рэпрэзентацыі вясельных матэрыялаў: «манаграфічны», калі друкаваліся або толькі фальклорныя, або толькі этнаграфічныя матэрыялы, і сінтэтычны, калі абрад або яго частка падаваліся разам з прымеркаванымі да іх вясельнымі песнямі, прыпеўкамі, прыказкамі, выслоўямі і г. д.

Пэўнае ўяўленне аб вясельнай абраднасці Гомельшчыны як той частцы абрадавай культуры, што грунтуецца на вуснай камунікацыі ўдзельнікаў, якая арганізуе вясельны сюжэт, дае зборнік Зінаіды Радчанка «Гомельскія народныя песні (Беларускія і Маларускія)» (1888), запісаныя ў Дзятлавіцкай

воласці Гомельскага ўезда Магілёўскай губерніі. 172 вясельныя песні складаюць даволі значную частку зборніка (для параўнання: каляндарна-абрадавых – 107, пазаабрадавых – 300). З. Радчанка прыводзіць шэраг дэталей вясельнага абраду на Гомельшчыне, якія маюць ярка выражаны мясцовы каларыт: адмова нявесты ад шлюбу, развіванне касы і інш.. Пры гэтым яна заўважае, што па свайму складу запісаныя на Гомельшчыне вясельныя песні «адрозніваюцца ад велікарускіх вясельных» [12, *XXXII*].

Я. Ф. Карскі даў высокую ацэнку зборніку «Вопыт апісання Магілёўскай губерніі» (1882) пад рэдакцыяй А. С. Дэмбавіцкага. У ім змешчаны вясельныя песні з Магілёўшчыны і Гомельшчыны (316 нумароў). На жаль, не ўсюды адзначана, дзе запісваліся творы. Да таго ж, як піша Н. С. Гілевіч, «усе запісы ўніфікаваны на адзін лад, зведзены да аднаго з дыялектаў» [4, *59*], што не дазваляе іх геаграфічна ідэнтыфікаваць.

Са з'яўленнем працы «Ліцвіны-Беларусы Чарнігаўскай губерніі, іх быт і песні» (1902) беларускай фалькларысткі, этнографа і пісьменніцы М. М. Косіч пачынае сцвярджацца падыход да вяселля як да цэласнага фальклорна-этнаграфічнага комплексу. Вясельны абрад прадстаўлены апісаннем розных яго этапаў (сватанне, заручыны, напярэдадні вянца, дзяленне каравая, дарэнне падарункаў) і пададзены разам з песнямі Мглінскага павета [8].

Адной з буйных прац канца XIX ст. з'яўляецца шматтомны «Беларускі зборнік» Е. Р. Раманава, які ў восьмым і дзевятым выпусках 1912 г. прадставіў апісанне народных вераванняў і быта беларусаў, іх каляндарныя і сямейныя святы. Еўдакім Раманавіч падрабязна апісвае вясельны абрад Гомельскага, Рагачоўскага і Быхаўскага ўездаў (в. Дубраўка, с. Хонава, с. Гарадзец). Паралельнае размяшчэнне этнаграфічнага і паэтычнага матэрыялу дае магчымасць зразумець абрадавыя вытокі вясельных песень, іх функцыянальнае прызначэнне, адпаведнасць модуса мастацкасці камунікатыўнай стратэгіі абраднасці. Е. Р. Раманаў меў рацыю сцвярджаць, што «кожнае народнае вяселле ёсць своеасаблівая опера» [13, *VI*]. Нездарма потым яго словы паўтарыў Р. Р. Шырма. Вясельныя песні пададзены з захаваннем мясцовых асаблівасцей. Так, у Гомельскім павеце зафіксавана 55 песень, у Рагачоўскім – 47, у Быхаўскім – 35. Бачна прымеркаванасць твораў да пэўнага этапа вяселля: сватання, заручынаў, дамаўлення са святаром, пасля вянчання, абраду «віцця елкі», дзялення каравая, збору дружыны перад ад'ездам да нявесты, пасаду маладой, «завівання касы», пярэзваў, дарэння гасцінцаў і многія інш. [13]. Е. Р. Раманаў «пакінуў нашчадкам не толькі багацейшыя зборы духоўных скарбаў народа, але і выдатны прыклад таго, як трэба ставіцца да гэтых скарбаў» [4, *76*].

На вясельную абраднасць Гомельшчыны абапіраўся М. В. Доўнар-Запольскі ў фальклорна-этнаграфічнай працы «Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках» (1893). Тут мы знаходзім запісы песень з Рэчыцкага і Мозырскага паветаў, якія пададзены згодна абрадаваму сюжэту. Аўтар спыняецца на адметных дашлюбных звычаях. Напрыклад, звычай *падання рукі* ў Рэчыцкім павеце, калі хлопец на вячорках тайна імкнецца

пацiснуць дзяўчыне руку, а яна адказвае яму, азначала яе папярэднюю згоду на шлюб. Аўтар звяртае ўвагу і на каляндарную прымеркаванасць вяселляў на Гомельшчыне: «Гряная нядзеля», май або перад жнівом [6]. Па-сутнасці, менавіта М. В. Доўнар-Запольскі заклаў падмурак навуковага даследавання вясельнай абраднасці беларусаў такімі, акрамя згаданай вышэй, шматаспектнымі працамі, як «Беларускае вяселле і вясельныя песні» (1888), «Матывы вясельных песень пінчукоў» (1893), «Сонейка і месяц у беларускай вясельнай паэзіі» (1894) і інш.

Асобна трэба сказаць пра значэнне працы Я. Ф. Карскага «Народная паэзія», якая склала першы выпуск трэцяга тома «Беларусы» (1916), для развіцця беларускай фалькларыстыкі і даследавання вясельных песень беларускага народа. Па-першае, вучоны даў прыклад спалучэння параўнальна-гістарычнага метаду з міфапаэтычным, што не ўсімі было ацэнена. Па-другое, ён скіроўваў увагу на тыя дэталі і вобразы, якія надаюць творам нацыянальны каларыт. Па-трэцяе, вылучыў галоўныя моманты вяселля і апісаў іх, суправаджаючы тлумачэннямі як папярэдніх даследчыкаў, так і ўласнымі. Для нас асабліва важныя заўвагі Я. Ф. Карскага адносна абраду віцця «елкі» і песень, якія выконваюцца падчас яго, бо «елка» – гэта своеасаблівы элемент вяселля Гомельскага Палесся [7, *272*].

Не ўсе тлумачэнні вобразаў, дадзеныя Я. Ф. Карскім, задаволяць сённяшніх даследчыкаў (напрыклад, тэзіс аб пярэваратніцкіх якасцях жаніха), але распрацаваная ім мадэль апісання вясельнай абраднасці і паралельнай інтэрпрэтацыі вобразнасці не страчвае каштоўнасці на працягу стагоддзя і шырока выкарыстоўваецца ў розных рэгіянальных і агульнанацыянальных выданнях.

Трэба адзначыць, што працы XIX – XX стст. маюць такі недахоп, як няпоўнасць апісання мясцовых асаблівасцей вясельнага абраду на Гомельшчыне. Аднак з апошняй чвэрці XX ст. фалькларысты пачынаюць даследаваць вясельную абраднасць з іншага боку – семантычнага, звяртаюцца да разгляду прадметнага, персанажнага, акцыянальнага і сімвалічнага кодаў.

На важнасць класіфікацыі суб'ектаў вясельнага абраду, прадметаў, якія выкарыстоўваліся на вяселлі, засяродзіў увагу А. В. Гура ў манаграфіі «Шлюб і вяселле ў славянскай народнай культуры: семантыка і сімволіка». Аўтар даволі падрабязна аналізуе лакальна-рэгіянальныя найменні вясельных чыноў [5, *173*] і спецыфічныя функцыі: «У гомельскім Палессі рыхтуюць шлюбную пасцель і ўкладваюць маладых *пасцельніца* разам з *дружком*» [5, 175]. У Веткаўскім раёне вясельную пару з боку нявесты прадстаўлялі *цыган* і *цыганка*. На мозырскім вяселлі ўзначальваў поезд да жаніха *старшы маршалак* [5, 189]. У манаграфіі апісаны і спецыфічныя сімвалічныя атрыбуты вяселля. Напрыклад, каравай, які выпякалі для жаніха, меў назву «*каравай*», а для нявесты _ «*шышка*» [5, *248*]. Вясельнае дрэўца называлі «*ёльцэ*» ў Калінкавіцкім раёне, «*ільцэ*» ў Мазырскім, «*вільцэ*» ў Хойніцкім, «*вэльцэ*» ў Нараўлянскім [5, *259*]. Нявеста не мела права здымаць вянок, які апранала падчас вырабу каравая, пакуль не падыйдзе цеста [5, *292*].

У кантэксце этнамузыкалогіі вясельныя песні разгледзеў У. І. Раговіч. Асноўныя прынцыпы класіфікацыі тыпавых напеваў вясельных песень ён акрэсліў у другім томе «Песенны фальклор Палесся. Вяселле» [11].

Пэўныя здабыткі ў вывучэнні вясельнай абраднасці Гомельшчыны былі зроблены ў другой палове XX ст. на матэрыяле палявых экспедыцый пад кіраўніцтвам выкладчыкаў БДУ імя У. І. Леніна. Сістэматызаваны песенны матэрыял апублікаваны ў зборніку «Палескае вяселле» В. А. Захаравай. Вясельная абраднасць Гомельшчыны прадстаўлена матэрыяламі з Рэчыцкага раёна, песні якога ўключаны ў склад зборніка [9].

Пад кіраўніцтвам В. А. Захаравай у 1989 г. выйшла кніга «Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць». Яна ж з’яўляецца аўтарам раздзела «Вясельны абрад і песні» [1, *124–161*], дзе прадстаўлены нотныя расшыфроўкі У. І. Раговіча. Выдзелены, апісаны і пракаменціраваны наступныя этапы вяселля разам з уласцівымі ім песнямі: 1. Пярэпыты. 2. Сватанне. 3. Заручыны. 4. Вяночкі. 5. «Ёлачка». 6. Выпечка каравая. 7. Першы дзень вяселля. 8. Другі дзень вяселля. 9. Трэці дзень вяселля. 10. «Цыганы». 11. Госці.

На жаль, у апісанні вельмі слаба прадстаўлена мясцовая абрадавая тэрміналогія. У кнігу ўвайшлі 82 вясельныя песні з Хойніцкага, Рагачоўскага, Нараўлянскага, Светлагорскага, Калінкавіцкага, Ельскага, Буда-Кашалёўскага раёнаў, у тым ліку песня пра «ёлку» з Салігорскага:

*Да вілі ёлку на сяле,*
*На сяле,*
*Ды пілі гарэлку на стале.*
*Ды гарэлка наша з сытою,*
*З сытою,*
*Малады Іванька з жаною!..* [1, *133*].

Звод «Беларуская народная творчасць» пачаў друкавацца з 1970 г. Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Серыя БНТ «Вяселле. Песні» ў шасці тамах змяшчае этнаграфічны матэрыял (першы том) і фальклорныя тэксты. Уступныя артыкулы, каментары да тэкстаў і даведачныя матэрыялы даюць звесткі аб формах бытавання твораў, выканаўцах, геаграфічнай прымеркаванасці песень [2].

Першы том (1980), прысвечаны песням заручын і ад’езду маладога да нявесты, складаецца з 1227 песень, з якіх на долю вясельных Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Гомельскага, Жыткавіцкага, Капаткевіцкага, Кармянскага, Лельчыцкага, Лоеўскага, Мазырскага, Мглінскага, Нараўлянскага, Рагачоўскага, Рэчыцкага, Хойніцкага раёнаў прыходзіцца 121. Ва ўступным артыкуле Л. А. Малаш адзначыла, што ёсць творы, характэрныя толькі для пэўнага рэгіёна. Напрыклад, на поўдні «асабліва шырокім і “песенным” быў каравайны абрад, а на поўначы – зборнай суботы», «рытуал “калінкі” на поўначы існуе толькі ў скарочаным выглядзе, у той час як на поўдні ён вельмі шырокі і суправаджаецца значнай колькасцю песень» [2, кн. 1., *13*]. Заўвагі даследчыцы ў дачыненні да паўднёвай

вясельнай традыцыі даюць напрамак функцыянальнага ўдакладнення складу вясельных песень Гомельшчыны.

Другі том (1981) уключае песні каравайнага абраду, зборнай суботы і пасада, з якіх 268 песень з Веткаўскага, Мазырскага, Брагінскага, Добрушскага, Ельскага, Лельчыцкага, Дзяржынскага, Рагачоўсага раёнаў.

Трэці том (1983) складаецца з сірочых песень, песень, якія спявалі пасля вянчання, у доме маладай або перад ад'ездам маладога. На фоне 1305 адзінак новых запісаў вясельных песень на Гомельшчыне тут няшмат (в. Цясны Лоеўскага і в. Беразіна Буда-Кашалёўскага раёнаў). У асноўным прыклады запазычаны з прац З. Радчанка і Е. Раманава.

Затое ў чацвёртым томе (1985), прысвечаным вяселлю ў маладой, Гомельшчына прадстаўлена багата – 513 песень з 1472, большасць якіх была запісана ў Мазырскім, Рагачоўскім, Гомельскім, Столінскім, Жыткавіцкім раёнах.

Пяты (1986) і шосты (1988) тамы прадстаўляюць больш за 2000 песень, якія суправаджаюць ад'езд маладой да маладога. Тамы не багатыя на гомельскія вясельныя песні і абмежаваныя запісамі з Жыткавіцкага, Веткаўскага і Гомелькага раёнаў.

У томе «Вяселле. Абрад» (1978) вяселле на Гомельшчыне прадстаўлена запісамі Е. Р. Раманава ў Гомельскім павеце і К. Машынскага ў Мазырскім.

Сучасныя даследчыкі вясельнай абраднасці Гомельшчыны, у першую чаргу В. С. Новак, галоўнай задачай лічаць фіксацыю як мага большай колькасці яе мясцовых варыянтаў. Фальклорна-этнаграфічны зборнік «Вяселле на Гомельшчыне» (2003) змяшчае багаты фактычны палявы матэрыял і «дэманструе багатую карціну варыянтнасці як самога абраду, так і песеннага складу вяселля, якое ў цэлым захоўвае агульную структуру беларускай вясельнай абраднасці» [3, *3*]. Аднак пры ўсёй агульнасці рэпрэзентатыўны *склад* тэрміналогіі абрадаў на Гомельшчыне адметны. Так, пазначаецца, што пaслявясельная частка мае наступныя лакальныя назвы: «гуляць разгуліны», «гуляць банкеты», «вадзіць цыганоў», «пірагі, госці», «хвост», «гуляць куру», «крошкі», «пята», «пярэзвы», «ламаць печ» і інш. [3, *4*]. Варыянтны песенны рэпертуар пададзены ў зборніку з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі. Песенны рэпертуар раёнаў Гомельшчыны прадстаўлены ў зборніку больш-менш раўнамерна. Так, з Акцябрскага раёна 66 песень, з Брагінскага – 57, з Буда-Кашалёўскага – 50, з Веткаўскага – 92 і да т. п. [3].

Сёння фалькларысты пашыраюць тэарэтычную базу вывучэння нацыянальнай культуры, распрацоўваюць прадукцыйныя падыходы да даследавання вясельнай паэзіі, у прыватнасці комплексны. Асабліва адзначым шосты том «Традыцыйнай мастацкай культуры Беларусаў» – «Гомельскае Палессе і Падняпроўе» (2012), дзе прадстаўлены аўтэнтычныя матэрыялы з Лельчыцкага, Жыткавіцкага, Добрушскага і іншых раёнаў [14].

Раздзел «Вяселле» падрыхтаваны Т. Б. Варфаламеевай. У «Прадмове» да тома акцэнтуецца наступнае: «Рэгіянальная спецыфіка <...> мае найбольш выразныя рысы ў вяселлі, якое змяшчае мноства кампанентаў у абрадавым

складзе і парадку вядзення абраду, атрыбутах, сюжэтах і напевах песень, характэрных толькі для рэгёна Гомельскага Палесся і Падняпроўя» [14, 7]. Напрыклад, звычай расчэсвання касы пры апрананні маладой быў распаўсюджаны пераважна на тэрыторыі Усходняй Гомельшчыны і суправаджаўся адпаведнай песняй:

*Каса ж мая, косачка, каса русая,*
*Эй, каса русая.*
*Не раз, не два косачку, касу часала,*
*Эй, касу часала.*
*За ’дзін вічарочычак касу прайграла,*
*Эй, касу прайграла...* [14, *510*].

На фоне даследаванняў XIX – XX стст., тэарэтычнага асэнсавання палявога матэрыялу, надрукаванага збіральнікамі, асабліва выразна бачна недастатковая вывучанасць камунікатыўнай стратэгіі вясельнай абраднасці Гомельшчыны. Каштоўныя публікацыі толькі ўскосна закранаюць некаторыя праблемы і аспекты. Галоўная задача заключаецца як у вызначэнні лакальна-рэгіянальных асаблівасцей гомельскага вяселля, так і ў даследаванні вясельнага абраду як комплекснага камунікатыўнага дзеяння з адметнымі «сілавымі» лініямі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / уклад. В. А. Захарава і інш. ; уклад. муз. часткі У. І. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

2. Вяселле. Песні : у шасці кнігах. / склад. : Л. А. Малаш ; муз. дадат. З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980 – 1988.

3. Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад. І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск : ЛМФ «Неман», 2003. – 472 с.

4. *Гілевіч, Н. С.* З клопатам пра песні народа / Н. С. Гілевіч. – Мінск : Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1970.

5. *Гура, А. В.* Брак и свадьба в славянской народной культуре : Семантика и символика / А. В. Гура. – М., 2012. – 935 с.

6. *Довнар-Запольский, М. В.* Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках / М. В. Довнар-Запольский // Живая старина. – 1893. – 189 с.

7. *Карский, Е. Ф.* Белорусы. В 3 т. Очерки словесности белорусского племени / Е. Ф. Карский. – Минск : БелЭН, 2007. – Т. 3, кн. 1. – 584 с.

8. *Косич, М. Н.* Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни / М. Н. Косич. – С.-Петербург, 1902. – 151 с.

9. Палескае вяселле / уклад. і рэд. В. А. Захаравай. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 303 с.

10. Полесье. Материальная культура / В. К. Бондарчик [и др.] ; АН УССР. Львовское отделение Института искусствоведения, фольклора и этнографии им. М. Ф. Рыльского ; под общ. ред. В. К. Бондарчика. – Киев : Наук. думка, 1988. – 448 с.

11. *Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся. В 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2002. – Т. 2 : Вяселле. – 590 с.

12. *Радченко, З.* Гомельские народные песни (белорусские и малорусские) / З. Радченко // Записки ИРГО по отделению Этнографии / под ред. Ф. М. Истомина. – СПб.: Типография В. Безобразова, 1888. – Том XIII, выпуск II. – 315 с.

13. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.

14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк. – 2012. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1. – 910 с.